# Вечары і выстаўкі, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння В. Гюго

Грамадскасць сталіцы Савецкай Беларусі адзначыла 150-годдзе з дня нараджэння вялікага сына французскага народа, выдатнага пісьменніка — змагара за свабоду і мір Віктора Гюго.

26 лютага ў Беларускім дзяржаўным тэатры імя Янкі Купалы адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны знамянальнай даце. Ушанаваць памяць славутага пісьменніка прышлі літаратары, дзеячы мастацтва, інтэлігенцыя горада, рабочыя прадпрыемстваў — шматлікія чытачы і прыхільнікі таленту вялікага мастака слова.

Вечар уступным словам пра Віктора Гюго, як пра пісьменніка — барацьбіта за мір паміж народамі, за разняволенне простага чалавека — адкрыў лаурэат Сталінскай прэміі Максім Танк.

З дакладам аб творчасці В. Гюго выступіў кандыдат філалагічных навук Д. Фактаровіч. Дакладчык ахарактарызаваў жыццёвы і творчы шлях французскага літаратара, слова якога жыве і сёння і дапамагае прыхільнікам міру ва ўсім свеце ў іх барацьбе з падпальшчыкамі новай крывавай бойні.

Пасля даклада калектыў тэатра імя Янкі Купалы паказаў прысутным спектакль па п'есе А. Макаёнка «На досвітку».

* * *

У канферэнц-зале Акадэміі навук БССР адбылося ўрачыстае паседжанне аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР, праўлення Таварыства па распаўсюджванню навуковых і палітычных ведаў і Інстытута літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР. З дакладам «Жыццё і творчасць Віктора Гюго» выступіў правадзейны член Таварыства Н. Лапідус. З мастацкім чытаннем урыўкаў з твораў пісьменніка-гуманіста выступілі артысты мінскіх тэатраў.

* * *

Студэнты і выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна да юбілейнай даты падрыхтавалі і правялі тэматычны літаратурны вечар, на якім быў прачытаны даклад аб жыцці і літаратурнай дзейнасці Віктора Гюго. Удзельнікі гуртка студэнцкай мастацкай самадзейнасці выканалі асобныя ўрыўкі з твораў пісьменніка.

* * *

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя В. І. Леніна да гэтай даты арганізавала выстаўку літаратуры. На выстаўцы многа твораў Віктора Гюго на мовах амаль усіх народаў СССР. Літаратурныя выстаўкі, прысвечаныя В. Гюго, арганізаваны ў Мінскай гарадской бібліятэцы, а таксама ў бібліятэках імя М. Горкага, імя В. Белінскага, імя Н. Астроўскага і другіх.